# ЛЕАНІД ЛЕВАНОВІЧ

## н. у 1938

Творчасць Леаніда Левановіча з'яўляецца адным з найбольш значных дасягненняў беларускай рэалістычнай прозы апошняй трэці XX і пачатку XXI ст. У напісаных ім нарысах, эсэ, апавяданнях і аповесцях адлюстраваны характэрныя заканамернасці духоўнай і сацыяльнай самарэалізацыі асобы ва ўмовах сучаснасці. Л. Левановіч з'яўляецца таксама аўтарам цыкла раманаў, у якіх лакальная карціна жыцця ў паўднёва-ўсходнім рэгіёне Беларусі паказана ў цеснай сувязі з важнейшымі падзеямі нацыянальнай і агульнаеўрапейскай гісторыі. У напісаных Л. Левановічам п'есах таксама адлюстравана сутнасць характэрных для эпохі выклікаў, паказаны духоўныя і сацыяльныя рэсурсы пераадолення канфліктаў.

Леанід Кірэевіч Левановіч (сапр. Лявонаў) нарадзіўся 14 верасня 1938 г. у вёсцы Клеявічы Касцюковіцкага раёна Магілёўскай вобласці ў сялянскай сям'і. Вучыўся ў Клеявіцкай сямігодцы і ў Магілёўскім культасветвучылішчы, навучанне ў якім закончыў у 1956 г. Працаваў інструктарам Дзяржынскага раённага дома культуры Мінскай вобласці, загадчыкам сельскага клуба ў вёсцы Гаўрыленка Касцюковіцкага раёна, дырэктарам РДК у Касцюковічах. У 1958—1961 гг. служыў на Балтыйскім флоце і адначасова завочна вучыўся на аддзяленні журналістыкі Белдзяржуніверсітэта. Вучобу закончыў на стацыянарным аддзяленні у 1963 г. У 1963—1965 гг. працаваў літсупрацоўнікам штотыднёвіка «Літаратура і мастацтва», рэдактарам аддзела мастацтва, крытыкі і бібліяграфіі часопіса «Нёман» (1971—1974 гг.), адказным сакратаром, а потым загадчыкам аддзела навукі і мастацтва часопіса «Полымя» (1975—1979 гг.). Затым была праца на тэлебачанні (1979—1982 гг.). З 1982 па 1986 г. пісьменнік быў на творчай рабоце, а з 1986 г. да выхаду на пенсію працаваў у выдавецтве «Мастацкая літаратура».

У друку першыя мастацкія творы празаіка з'явіліся ў 1963 г. Газета «Советская Белоруссия» 17 красавіка надрукавала яго апавяданне «Гусакова дарога». У «Сельскай газеце» 28 ліпеня было



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

апублікавана апавяданне «На рыбалке». На пачатку творчага шляху Л. Леванові ч аддаваў перавагу нарысам, якія пісаў на рускай мове. На беларускай мове гэтыя творы былі апублікаваны ў зборніках «Зялёны трохкутнік» (1973) і «Хлеб і мужнасць» (1987). Адначасова пісьменнік працаваў і ў драматургіі. П'есы «Ці любіце вы грэчку?» (1972), «Пасля разводу» (1972), «Чабарок» (1973), «Павел і Хуаніта» (1974) па форме блізкія да драматычных аповесцяў: аўтар імкнуўся стварыць інтэграваны вобраз — трохкутнік, каб інтрыга і медытацыя працавалі не на распальванне азарту барацьбы, а на кансалідацыю грамады, пераважна сялянскай і некаторых слаёў інтэлігенцыі. Падобныя мэты і спосабы пераадолення памылак уласцівыя і аповесцям, якія ўключаны ў зборнікі «Партызанская мадонна» (1976), «Якар надзеі» (1979), «Дзікая ружа» (1993), «Ларыса, альбо Прыгоды аўтамабіліста» (1998), «Сіняе лета» (2005).

Пашыраючы маштабы псіхалагічнай дэтэрмінацыі і матывацыі чалавечага дзеяння, Л. Леванові ч у 1970-х гадах заканамерна выходзіў на праблему гістарычнага лёсу беларускага народа. Не звяртаючы ўвагі на праявы ў крытыцы адмоўнага стаўлення да традыцыйнай раманнай формы, ён у 1980-х гадах пачынае працу над серыяй раманаў, праблемна і тэматычна аб'яднаных у хроніку быцця некалькіх пакаленняў на ўсходзе беларускага Прыдняпроўя: «Шчыглы» (1986), «Паводка сярод зімы» (1989), «Дзікая ружа» (1993), «Сіняе лета» (2003), «Бесядзь цячэ ў акіян» (2007), «Палыновы вецер» (2009). Л. Леванові чу у 1999 г. была прысуджана Літаратурная прэмія імя І. Мележа за кнігу «Ларыса, альбо Прыгоды аўтамабіліста». Землякі надалі пісьменніку статус ганаровага грамадзяніна Касцюковіцкага раёна. Сваю прэмію празаіку прысвоіла Федэрацыя прафсаюзаў Рэспублікі Беларусь.

Арыенцірамі на шляху грамадзянскага і творчага станаўлення для Л. Леванові ча былі найперш выдатныя дзеячы беларускай культуры і навукі, што нарадзіліся і гадаваліся ва Усходнім Паднямпроўі — Максім і Гаўрыла Гарэцкія, А. Куляшоў, А. Пысін. У зрусіфікаванай вясковай сямігодцы яму пашанцавала вучыцца ў таленавітай настаўніцы рускай мовы і літаратуры Г. Глазоўскай, якая заўсёды заахвочвала яго да літаратурнай творчасці на беларускай мове. Пра свой лёсавызначальны творчы выбар пісьменнік шчыра расказаў у спавядальнай форме эсэ «Ліст да Якуба Коласа» (2002): «Мой ліст да Вас, дарагі дзядзька Якуб, гэта споведзь былога манкурта. Хоць любіў чытаць Вашы творы ў школьныя гады, а першыя апавяданні падрыхтаваў на рускай мове, першыя сур'ёзныя нарысы — пра беларускі мёд, пра нашы сады, пра бульбу надрукаваў у «Нёмане» па-руску. І ў вясковай сямігодцы

родную мову выкладалі кепска, а ў Магілёўскім культасветвучылішчы, на журфаку ў БДУ свядома адвучвалі ад яе. Тады я нічога не разумеў, лічыў, што так і трэба. Менавіта ў Эстоніі — служыў у Таліне матросам — я адчуў сябе беларусам, але шлях да Беларусі быў доўгі і пакручасты. Толькі на 33-м годзе я надрукаваў першыя апавяданні на роднай мове пад псеўданімам Леанід Левановіч. Дарэчы, дапамог выбраць псеўданім выдатны пісьменнік Іван Мележ»[1].

Зварот да памяці і спадчыны Я. Коласа быў крокам да паглыбленай рэфлексіі беларускага эстэтычнага вопыту, пачынаючы з нашаніўскага перыяду. Першапачатковы яго сэнс сканцэнтраваны ў імператыве Я. Купалы: «Выйдзі з-пад дзікай апекі». Пра сваё выйсце з-пад апекі і ўваходжанне ў сілавое поле беларускамоўнай творчасці Л. Левановіч успамінае ў эсэ «І за гарою пакланюся» (2002), якое прысвечана творчасці Ф. Янкоўскага: «У студзені 1969 года я зрабіў рашучы крок — перайшоў з «Сельскай газеты» ў газету «Літаратура і мастацтва». Перайшоў — не тое слова. Я ледзьве вырваўся, як птушка з клеткі. Двойчы засядала рэдкалегія, зубры «Сельскай газеты» ўшчувалі: чаму я, камуніст, супрацоўнік аддзела партыйнага жыцця, кідаю орган ЦК КПБ, што рэдакцыя забяспечыла мяне кватэрай»[2].

Вызваленне з-пад апекі «зуброў» — гэта грамадзянскі ўчынак, з якога пачынаўся рух пісьменніка да спасціжэння глыбінных сэнсаў народнай філасофіі, эстэтыкі і этыкі, па-новаму асэнсаванай і вернутай народу Я. Коласам у яго пяцікніжжы: «Новай зямлі», «Сымоне-музыку», «Казках жыцця», трылогіі «На ростанях» і «Рыбаковай хаце». У коласаўскім варыянце народнай аксіялогіі дамінуе традыцыйная ў беларускай культуры гаспадарская парадыгма, чым якраз і забяспечваецца ўзнікненне незразумелага для *чалавека збоку* феномена — беларускага паэтычнага ліра-эпасу ў XX ст. на фоне радыкальна прагматызаванай, прыстасаванай да рынкавай кан'юнктуры еўрапейскай наасферы. Трансфармацыя журналіста Л. Лявонава ў пісьменніка Левановіча зачыняла яму шлях да кар'ерных вышыняў, але з гэтага рубяжа пачынаўся рух творчай асобы да ўзбагачэння незабруджанымі скарбамі беларускага духу, спасціжэння гуманізуючых сэнсаў беларускай культуры. Апорнымі вехамі на гэтым шляху сталі насычаныя плёнам працы душы і розуму мастацкія канцэпты *мужыцкая праўда — новая зямля — вялікае сэрца*. Сінтэз беларускага панэстэтызму і ўніверсальнай — у трактоўцы А. Швейцара —

---

[1] Левановіч Л. Прызнанне ў любові: ліст да Якуба Коласа // Усмешлівая Амерыка. Мінск, 2005. С. 164.

[2] Левановіч Л. Прызнанне ў любові: ліст да Якуба Коласа. С. 148—149.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

этыкі быў грунтам, на якім выспеў годны адказ на нігілісцкія выклікі пачатку XX ст.

Літаратурнае пакаленне беларускіх «шасцідзясятнікаў» апынулася ў сітуацыі выбару аб'екта мастацкага даследавання: *праўда веку ці апраўданне* крыві? Выбар залежаў ад уяўленняў творчай асобы пра ідэалы паўнавартаснага чалавечага існавання. Мастацкая сістэма беларускай літаратуры першай паловы XX ст. заснавана на грунце светаадчування, якое можа быць азначана як фальклорны экзістэнцыялізм. К. Чорны абазначыў яго мастацкім канцэптам *радасць існавання*, што было яўнай альтэрнатывай ідэалагеме *класавая нянавісць*. У творчасці Л. Левановіча перажыванне і асэнсаванне *радасці жыцця* адлюстравана глыбока і пераканаўча ў трагічнай сітуацыі яго раманаў, але гэта сведчанне не пераймальнасці, а пераемнасці нацыянальнага стылю ў літаратуры. Ужо ў «Зялёным трохкутніку» Л. Левановіч выразна акрэсліў абрысы беларускага сацыяльнага і духоўнага ідэалаў, якія жывуць у творах не ў форме дэкларацыі, а як адчуванне, як настрой і стымул грамадзянскіх паводзін аўтара, як імкненне падпарадкаваць колькасную шкалу ацэнкі быцця крытэрыям якасным.

Структура тагачаснага нарыса была заснавана пераважна на дэманстрацыі з дапамогай лічбаў эканамічнай выгады, якая ідзе следам за наватарскімі рашэннямі ў гаспадарчай дзейнасці. Практыкаванні з лічбамі займаюць значную плошчу і ў мастацкай прасторы «Зялёнага трохкутніка». Аднак галоўная ідэя, якой прасякнуты нарысы кнігі, скіравана на праблему *якасці жыцця*. Бюракратыя кіруецца метадам рэдукцыі, абвяшчаючы асобныя галіны вытворчасці «негалоўнымі». Праз пэўны час «неперспектыўнымі» будуць прызнаны шматлікія вёскі. У нарысах Л. Левановіча з асобных фрэскаў непрыкметна ствараецца абагульнены вобраз сучаснага соцыуму. Сацыяльная структура паўстае як вертыкаль васалітэту начальнікаў і падначаленых, кіраўнікоў і работнікаў, камандзіраў і выканаўцаў. Структурны прынцып тыраніі не прадугледжвае асобу гаспадара, зацікаўленага лёсам этнасу. Грамадзяне з'яўляюцца службоўцамі. Аднекуль зверху ім даюцца нормы і лічбы, а яны павінны забяспечыць *валавы* збор. Л. Левановіч не выпадкова надае вялікі сэнс выказванню акадэміка П. Альсміка: «*Прыціснулі бульбу два ворагі: рак і вал*»[3]. Вал у нарысах успрымаецца як ракавая пухліна ў кіраўнічай вертыкалі. Па маштабах разбуральнай дзейнасці ён нагадвае міфалагічнага Ваала, якому падданыя прыносілі ў ахвяру самыя каштоўныя падарункі — сваіх дзяцей.

[3] Левановіч Л. Зялёны трохкутнік. Мінск, 1973. С. 10.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

Гон за валавымі, колькаснымі паказчыкамі і занядбанне якаснага аспекту жыцця выклікае трывогу за лёс існуючага і наступных пакаленняў. Аднабаковы падыход да нарошчвання ўраджайнасці бульбы вядзе да катастрафічнага зніжэння крухмальнасці. З-за адсутнасці пладасховішчаў садавіна гніе ў калгасных садах. Гандлёвыя арганізацыі тым часам купляюць яблыкі за мяжой, даражэйшыя за свае і горшыя па якасці. Вішнёвыя сады ў Беларусі зніклі. Вішня, сімвал хараства і маладосці ў народнай культуры, імкліва выраджаецца. Атручаныя хімічнымі ўгнаеннямі пчаліныя сем'і гінуць ужо сотнямі. Без апылення застаюцца дубовыя гаі, грэчка, канюшына, ліпа. Вал, такім чынам, сімвалізуе ў нарысах Л. Левановіча сілу, якая над людзьмі мае ўладу, але пазбаўлена здольнасці і волі па-гаспадарску ўмела і адказна арганізаваць жыццё соцыуму. Вал — гэта зло, якое нагадвае магію, называную ў народнай культуры *заломам*.

Л. Левановіч у нарысах шукае і знаходзіць у чалавечай грамадзе сілу, альтэрнатыўную бюракратычнай машыне, запраграмаванай на ўтылізацыю і абясцэньванне духоўных каштоўнасцей. У беларускай міфалогіі і чарадзейных казках індывідуумы з ярка выражанай прагай да пошуку вышэйшых ісцін аб'яднаны ў псіхічны комплекс, азначаны у народнай антрапалогіі канцэптамі *цікаўныя* і *задумныя*. У літаратуры XIX ст. яны атрымалі статус рамантыкаў. У рускай літаратуры склалася традыцыя паказу рамантыкаў метадам *остранения* — як дзівакоў, людзей *странных*. Ф. Дастаеўскі абагульніў фальклорны тыпаж рамантыкаў у вобразе Ідыёта (Адзінокага) у аднайменным рамане — як альтэрнатыву рэнесансна-рамантычнаму радыкальнаму індывідуалізму. У беларускай літаратуры, аднак, нахіл да ізаляцыянізму расцэньваецца як анамалія ў сацыяльных паводзінах:

Няўжо не так? Няўжо вам не ахвотна
Прыслухацца да ісціны старой,
Што неспакой не лечыць адзінота,
Што адзіноту лечыць неспакой?[4]

Л. Левановіч у пытаннях сацыяльнай этыкі таксама прытрымліваецца «мудрасці старой»: «Вочы баяцца, а рукі робяць», «Гора гаруй, а рукамі вакой», «Хто не рупіцца, у таго скура лупіцца». У невялікім нарысе «Глыбокія карані» пісьменнік успомніў дэвіз, які падчас журналісцкіх камандзіровак яму пашанцавала прачытаць у дыспетчарскай калгаса: «Хто хоча нешта рабіць — знаходзіць сродкі, хто нічога не хоча рабіць — знаходзіць

[4] Куляшоў А. Цунамі // Зб. тв.: у 5 т. Т. 2: Паэмы. Мінск, 1975. С. 285.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прычыны»[5]. Гэтай народнай мудрасцю кіруюцца аграном Іван Данілевіч, брыгадзір Андрэй Ксёнда і старшыня Уладзімір Балюк, якія ўратавалі глебу ад эрозіі, што пачалася пасля па-галавацяпску праведзенай меліярацыі («Родныя карані»). Па сваёй ахвоце Іван Данілевіч ратуе ад спусташэння і духоўную ніву роднага кутка. Ён зрабіў фотакопію выдадзенай у XIX ст. кнігі Марыі Саковіч «Сяляне мястэчка Моталь і яго песні», збірае скарбы роднай мовы для музея. У нарысе «Сэрца ў будучыні жыве» з пачуццём шчырага захаплення і радасці Л. Лeвановіч раскрывае карціну вяртання да паўнацэннага жыцця сялян спаленай фашыстамі вёскі Доры ў Валожынскім раёне. Новы старшыня калгаса Сямён Шарэцкі пачынае адраджэнскі рух у Дорах з будаўніцтва дзіцячага садка, жылля і дарог. Культурная праграма старшыні адкрывала перспектывы для моладзі, гарантавала будучыню пакаленням.

На першы погляд можа паказацца, што сацыяльна-бытавая тэма ў нарысах Л. Лeвановіча нібыта перакрывае ўсе іншыя аспекты жыцця. Аднак пры больш уважлівым падыходзе высвятляецца, што выходнай пазіцыяй пісьменніка і яго крытэрыем ацэнкі быцця з'яўляецца норма беларускага пантэстэтызму. Галоўным героем апавядання-нарысу «Іванаў гай» з цыклу «Там, дзе Бесядзь-рака...» з'яўляецца былы салдат-франтавік, інвалід Іван Раўнягін з вёскі Бароньki ў Касцюковіцкім раёне. Каля сваёй хаты ён пакінуў маладзенькі бярэзнік, не даў заараць яго пад агарод і за гэта атрымаў атэстацыю дзівака: «няньчыцца» з бярозкамі, быццам з яблынямі. Раўнягін не дазволіў абламаць бярозы на венікі. Калі бярозкі падраслі, знайшоўся начальнік, які захацеў зрэзаць іх на аглоблі. Іван Раўнягін, хоць і на мыліцах, але, аднак жа, знайшоў управу і на аглабельшчыка. Белы бярозавы гай, узгадаваны і абаронены салдатам, інвалідам вайны, абуджае светлыя думкі ў людзей, што праязджаюць праз Бароньki паўз Іванаву хату, якую з трох бакоў акружае бярозавы карагод: «І я пасаджу дзесяткі два бяроз. Хай растуць. У мяне таксама чацвёра дзяцей: два сыны і дзве дачкі»[6]. Сітуацыя, перанесеная Л. Лeвановічам з жыцця ў празаічны эцюд, блізкая па сэнсе і структуры да той, якую сілай творчай фантазіі стварыў А. Куляшоў у лірыка-філасофскай медытацыі «Маёй рукой пасаджанай бярозе».

Сэнсавыя ёмкасці сімволікі, узятай Л. Лeвановічам з побыту, роўнавялікія тым, што засталіся беларусам у спадчыну ад папярэднікаў, найперш з тых, чый талент з маленства калыхалі чыстыя

[5] Лeвановіч Л. Хлеб і мужнасць. Мінск, 1987. С. 249.
[6] Там жа. С. 155.



РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

хвалі Бесядзі. А. Куляшоў і А. Пысін стварылі канцэнтраваную форму паэтычнай вербалізацыі беларускага культурнага канона XX ст. У А. Куляшова сумарны духоўны сэнс культурнага вопыту этнасу адлюстраваны ў сімволіцы снапа, коласа, плыні, сабранай з ручаінаў «у рэчышчы адным». А. Пысін сумарны сэнс намаганняў працоўнага духу азначыў канцэптам *вузел*, прыдатным як для мастацкай, так і для філасофскай творчасці ў руках думных нашчадкаў.

Вузел — гэта ў народнай сістэме пазнавальнага дзеяння сумарны мастацкі канцэпт, сімвал яднання сінгулярнасцей у абсалютным сэнсе, абсалютны дух, у Я. Купалы — «дух непрыгонны». Творчая інтуіцыя Л. Левановіча ў яго першых творах рухаецца наперад, арыентуючыся на традыцыйныя вехі культурнай памяці беларускага этнасу — на семантыку такіх вербальных вузлоў, як Дом, Сад, Бярозавы Гай, Пчэльня, Крыніца.

У нацыянальнай кагніталогіі менавіта гэтымі знакамі аздоблена дарога ў вырай — беларускі шлях да новай зямлі. У канцы 1950-х новай зямлёй была абвешчана цаліна. Л. Левановіч адчуў творчую патрэбу суаднесці беларускі сацыяльны і эстэтычны ідэалы з асваеннем цалінных зямель. У 1964 г. ён, як і М. Зарэцкі ў час калектывізацыі, зрабіў паездку на «новую зямлю», накіраваў сябе на цаліну сам. У 1983 г. пісьменнік наведаў Казахстан у складзе здымачнай групы Беларускага тэлебачання. Падарожныя нарысы «Зямля і людзі», «Хлеб і мужнасць» адлюстроўваюць у святле нацыянальнага ідэалу не толькі складаныя праблемы «цаліннай эпапеі», але і супярэчнасці і хранічныя хваробы савецкага соцыуму ў цэлым. Творчым здабыткам пісьменніка сталі новыя семантычныя вузлы, якія адлюстроўваюць вартасці цывілізацыі, зыходзячы з яе ролі ў лёсе пакалення: «Прыехалі ў саўгас з Мінска чатыры дзяўчыны: Алеся, Марыя, Валя і Ніна. Накіравалі іх на аддаленую ферму даглядаць авечак. Жылі дзяўчаты ў саманнай хатцы, спалі на тапчанах. Пачалася зіма. Снег, буран. Вакол — стэп, цемра. Толькі ваўкі выюць. А трэба ж сена прывезці, снег ад кашар адкінуць, кізяк прыбраць. І так з дня ў дзень»[7].

Такім быў пачатак новага жыцця на цаліне васямнаццацігадовых Алесі, Марыі, Валі і Ніны з Мінска — у саманнай хатцы, аточанай разам з авечымі кашарамі воўчай зграяй.

Ідэйна-мастацкія сэнсы мазанкі і аўчарні маюць працяг у крытычнай сітуацыі твораў, напісаных пазней. У нарысе «Хлеб і мужнасць» такім вузлом сэнсаў з'яўляюцца два магутныя трак-

[7] Левановіч Л. Хлеб і мужнасць. С. 9.

тары, замураваныя спрасаваным снегам падчас бурану у пустыні. Людзей, ужо амаль нерухомых, ўратаваў ад смерці казахтубылец, які запрог у сані каня і выехаў у стэп, рызыкуючы жыццём, калі вакол «усё змяшалася: і зямля, і неба, дзіка скавытала завіруха, снег забіваў вочы, рот, нельга было дыхаць»[8]. У гэты ж семантычны рад кладзецца ўспамін пра цаліпніка з Віцебшчыны — Алега Уфімцава, які на прадвесні 1955 г. узяўся ноччу даставіць у бальніцу хворага трактарыста: ўратаваць хлопца магла толькі неадкладная аперацыя. Алег дасягнуў мэты, ўратаваў чалавека, але сам загінуў: недалёка ад берага праламаўся лёд, у кабіну яго трактара хлынула ледзяная вада.

Л. Лекановіч ужо ў ранніх сваіх творах прадэманстраваў схільнасць да мастацкага мыслення ў форме вобразаў-вузлоў. У маленстве будучы пісьменнік адчуў, што акрамя повязі чалавека з родным светам, ёсць яшчэ і сацыяльная залежнасць асобы — *вязьмо*, атрыбутыўная рыса ўсіх цывілізацый. Беларускія цаліннікі хутка пераканаліся, што на новай зямлі пануе той самы яго вялікасць Вал. Яго не хвалююць бураны ў стэпе ці на асушаных тарфяніках нават тады, калі снягі зімой засыпаюць трактары з людзьмі ў кабіне, а летам вятры ўздымаюць у паветра верхні слой глебы і засланяюць сонца. Вал — не гаспадар, а шматвокае ліха, наглядчык, які пільна сочыць за тым, каб руплівыя старшыні калгасаў, земляробы-акадэмікі, стваральнікі супрацьэразійнай сельгастэхнікі не выйшлі з-пад яго ўлады і назаўсёды засталіся яго парабкамі. «Кроў з носа — сей чым паболей, — даверліва гаварыў журналісту дырэктар саўгаса Панамароў. — А лепей жа меней пасеяць, а болей намалаціць. Вось у чым штука. Вал нас і душыць. А як адмовішся? Не пасееш — здымуць з работы. А пасееш у чэрвені, ведаючы, што нічога не збярэш, — гэта спішацца на капрызы надвор'я»[9].

Вал не лічыцца ні з цаной, ні са стратамі, калі заўважае, што парабак разблытвае вязьмо і становіцца гаспадаром на зямлі. Вал у нарысах Л. Левановіча — арыгінальнае абагульненне вобраза зграі ваўкоў, якія ў казцы Ядвігіна Ш. «Дачэсныя» дояць па чарзе калектыўную карову — да крыві, а то яшчэ каторы стараецца ўварваць і кусок жывога мяса. Традыцыйныя пласты беларускай народнай кагніталогіі вывалзілі Л. Левановіча на праблему «чалавек на Зямлі», па сэнсе і форме аналагічную праблеме «чалавек на вайне», характэрную для прозы В. Быкава. Мастацкая тапалогія Л. Левановіча — гэта таксама «знакі бяды»: эрозіі глебы

[8] Левановіч Л. Хлеб і мужнасць. С. 133.
[9] Там жа. С. 23.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і душы. Адначасова яго нарысы — гэта знакі мужнасці бескампраміснага пазнання праўды веку, мужнасці вяртання на свой грунт. На гэтым шляху, расказвае пісьменнік, чалавек вяртаецца да сваёй імманентнай сутнасці, зноў становіцца гаспадаром сваёй нівы. Два разы ездзіў Генадзь Ткачук на цаліну. Зведаў уладу стыхіі ў зімовым стэпе. Быў на цаліне адзін і разам з раднёй. Яго паважалі людзі і па-свойму цанілі начальнікі, але па-сапраўднаму адчуў сябе Ткачук гаспадаром на зямлі, калі вярнуўся на сваю Гарадзеншчыну: «Хударлявы абветраны твар быў спакойны, засяроджаны, невялікая каржакаватая постаць моцна і ўпэўнена стаяла на зямлі. Мы павярнулі назад і зноў пайшлі вуліцаю. Вяскоўцы здалёк віталіся з Ткачуком, ён ветліва ківаў у адказ тым часам даводзіў, што <...> патрэбны новыя машыны, больш дасканалыя і больш магутныя»[10].

Творчы шлях Л. Левановіча пазначаны актуалізацыяй анталагічных і антрапалагічных сэнсаў і ўласцівых беларускай літаратуры каштоўнасных арыентацыяў, увасобленых у семантыцы канцэптуальных вобразаў нівы, хаты, дрэва, выраю, пчэльні, непарыўна з'яднаных з жыццятворнай сілай бязмежных прастораў кагнітыўнага быцця. Інфармацыйны выбух у сучасным грамадстве, дасягненні нанатэхналогіі, узрастаючая роля дзейнасці і барацьбы ў віртуальнай прасторы сталі падставай для мусіравання нігілісцкіх, так званых постчалавечых канцэпцый цывілізацыі. Адказам Л. Левановіча на выклікі мадэрнізаванага нігілізму сталі творы, у якіх пісьменнік смела пашырыў маштабы і аб'екты чалавеказнаўчага даследавання. Ад жанру нарыса-апавядання ён пераходзіць да формаў эпічнага тэатру і філасофскай аповесці. Ужо ў ранніх творах пісьменнік па-наватарску пашырае мастацкія ёмкасці лакальных, здавалася б, канфліктаў да межаў універсальнай праблемнай сітуацыі, паставіўшы беларускага Задумнага перад нябачным Валам (параўнаем: Хрыстос перад Пілатам, гусляр перад князем, Бандароўна перад Патоцкім).

З другой паловы 1970-х гадоў сітуацыя выбару ў творах пісьменніка трансфармуецца ў сітуацыю замкнёную, без выбару. У свой час Кандрат Крапіва параіў Л. Левановічу, пазнаёміўшыся з яго п'есай «Чабор»: «Трэба дамагацца большай канцэнтрацыі дзеяння. Гэта будзе толькі на карысць п'есе»[11].

Л. Левановіч пайшоў шляхам канцэнтрацыі сэнсавых ёмкасцей і ўнутранага дзеяння. Так узніклі па-філасофску насычаныя мастацкія канцэпты *падводная лодка* і *акварыум*. Ужо ў аповесці

---

[10] Левановіч Л. Хлеб і мужнасць. С. 145.

[11] Левановіч Л. Кандрат Крапіва ў маім лёсе // Усмешлівая Амерыка. Мінск, 2005. С. 104.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

«Якар надзеі» семантыка падводнай лодкі развіваецца ў напрамку, які ў «трактарнай» канцэптасферы цалінных нарысаў быў азначаны топасам *чалавек у кабіне*. Семантыка трактара ў бязмежнай белі зімовага стэпу па сваіх якасных параметрах амаль тоесная семантыцы падводнай лодкі ў халодных глыбінях мора. Халодныя вадзяныя валы «тысячатонным цяжарам навальваліся на субмарыну, а яна, як паплавок, узлятала на хвалю, і салёны вірлівы грэбень адно перакатваўся цераз рубку, шыпеў ад бяссільнай злосці»[12].

У ходзе творчай эвалюцыі пісьменніка міфалагема Вал па сэнсе і форме усё больш набліжаецца да такіх канцэптуальных персанажаў, як крылаты Змей, Упыр, Цмок, Вялікі інквізітар, Вялікі злодзей. Адначасова Л. Левановіч фарміруе і альтэрнатыўныя Валу філасафемы — семантычны ланцуг, у пачатку якога стаяць вобразы продкаў-землеробаў з часоў грамады (вёскі). У іх перанялі эстафету земляробы-акадэмікі (Альсмік і Бараеў у нарысах). На сучасным этапе гэты рух працягваецца дзесьці на самым дне светабудовы, у падводным царстве. У «Якары надзеі» вакол боцмана Кастуся Харашуна з Гарадзеншчыны збіраецца ў вольны час група цікаўных маракоў. Боцман цікавіцца філасофіяй. І вось маладыя людзі, глянуўшы на свет праз прызму філасофскага светласкопа Платона, Мантэня, Годвіна, знаходзяць для сябе формулу існавання ў сучасным, забруджаным адходамі цывілізацыі свеце: цвёрдасць, вернасць і добрасумленнасць. А на першы план група Харашуна вынесла праблему ачышчэння сацыяльнай паверхні ад бруду, прынесенага хваляй перверсіі — паталогіі ў сямейных і інтымных адносінах: «Чуе маё сэрца, — Харашун грукнуў кулаком у грудзі, — чуе, ядры тваю каламажку, ідзе хваля чысціні. Хваля пурытанізму... Высокая, чыстая хваля! Дзевяты вал цнатлівасці! І ён змые гэтую брудную пену. Вось пабачыце!»[13]

Аўтар і яго персанажы не чакаюць чыстай хвалі зверху, з трансцэндэнтнага свету. У народнай культуры заўсёды гарызантальная эманацыя мела перавагу над вертыкальнай. На думку Харашуна, народ «любіць чысціню ва ўсім і перш за ўсё — у каханні». Гэта перакананне заснавана на сутнасным разуменні чалавека як трохчленнага адзінства. Формула «Яна — Я — Яно» адлюстроўвае спецыфіку чалавечага інстынкту — патрэбу ў самаўдасканаленні чалавечага роду.

Захаванне і ўмацаванне сям'і з'яўляецца ключавым матывам у эстэтычнай праграме Л. Левановіча. Ён і Яна ў «Якары надзеі» —

---

[12] Левановіч Л. Якар надзеі // Ларыса, альбо Каханне аўтамабіліста. Мінск, 2013. С. 65.

[13] Левановіч Л. Якар надзеі. С. 92.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Алёша і Галя — за тры гады выпрабаванняў на жыццёвасць іх вернасці самі падрыхтавалі сабе праграму жыцця ў чысціні. Жыццёвасць гэтай праграмы пацвярджаецца тым, што пасля трагічнай гібелі Алёшы Галя, яшчэ зусім нядаўна засяроджаная на клопатах бягучага дня, у пісьме да Люсі раскрываецца ва ўсёй веліччы сваёй душы, як жанчына-маці, як жанчына-філосаф. Л. Левановіч глыбока пранікае ў трагічную сутнасць лёсу народа, які падышоў да фіналу ў гісторыі сваёй кананічнай культуры. Найбольш цяжкім выпрабаваннем з'яўляецца яма, пазначаная ў беларускай культуры намінацыямі *канец дружбы* і *ваўчыная яма*.

У другой палове XX ст. пераход у Беларусі ад кананічнай формы плужнага земляробства да індустрыяльнага суправаджаўся рассяляньваннем вёскі і дэтэрытарызацыяй свядомасці інтэлектуалаў. І зусім невыпадкова Галя падыходзіць пасля гібелі Алёшы да важнейшага рашэння: «Іншы раз думаю: падгадую дзіця, скончу ўніверсітэт і пераеду ў Алёшаву вёску назусім — хочацца працаваць там у школе, жыць на яго радзіме»[14].

Топапрывязка ў антрапалагічнай канцэпцыі Л. Левановіча адыгрывае вельмі істотную ролю. Адкрытую Мантэнем разгайданасць быцця ў гандлёвым соцыуме беларуская літаратура зафіксавала ў семіётыцы вобразаў *дрыгвы* і *людзей на балоце*. Л. Левановіч да агульнай карціны нацыянальнай мастацкай тапаграфіі далучыў топас *людзі на калёсах*. У гэтай кансістэнцыі асоба звычайна выступае ў ролі *аўтамабіліста*, *пасажыра* альбо *турыста*. Але — не гаспадара. Цывілізацыя, такім чынам, выпрабоўвае асобу ілюзіяй свабоды і нібыта сапраўднага, загадзя невядома кім ачышчанага ад будзённых клопатаў шчасця. Само жыццё сёння арыентуе пісьменніка на кантамінацыю разнастайных жанравастылёвых і кампазіцыйных формаў: плыні свядомасці, хронікі, дакументалістыкі і нават містыкі. Пры гэтым, аднак, у пісьменніцкім топааналізе Л. Левановіча часта дамінуе матыў чыстай мастацкай прасторы, у якой самарух псіхааналізу ажыццяўляецца нібы сам сабою, не чапляючыся за перашкоды побыту. Чыстая эстэтыка адкрывае шлях да пазнання крыніц самаруху і самаканстытуявання асобы. У апавяданні «Поўнае зацьменне месяца» нават цемень паказана ў яе «абсалютным», завершаным выглядзе. Да таго ж псіхічнае дзеянне сваёй кульмінацыі дасягае ўначы над раскапанай магілай. Рэквізіты містычнай рамантыкі не з'яўляюцца самамэтай для пісьменніка. Яго героі ўжо зведалі згрызоты, страты і нават зняволенне. Падобная сітуацыя ў прозе В. Адамчыка азначана топасам *па часе*.

---

[14] Левановіч Л. Ларыса, альбо Каханне аўтамабіліста. С. 164.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Л. Левановіч якраз і ставіць сабе за мэту паказаць віталісцкі патэнцыял беларускага духу на сцежках яго вяртання з замагільнага свету ў жыццё, каб «жыць нанова» (Я. Колас): «Упершыню пасля пахавання мужа Вольга моцна спала. Уранні ёй не хацелася плакаць, а калі прыгадала развітанне з Анатолем, як настойліва ён прасіў пазваніць, нават усміхнулася»[15].

У псіхааналізе Л. Левановіча патэнцыял пачынальнікаў неаднолькавы. Пісьменнік пранікае ў глыбіні псіхікі, у якіх фарміруецца здольнасць прайсці праз вернасць (М. Танк) — асноватворны псіхічны комплекс людскасці, маральнай чысціні. У апавяданні «Адналюб» (1986) дзед Кастусь успамінае сваю нябожчыцу-жонку: «І працавітая была, і акуратная. І дужа ўжо ласкава абыходзілася»[16]. Гарадскі інжынер Сямён для сябе адзначыў, што пры гэтых успамінах пажылога Кастуся «нейкая сумная прасветленасць расплывалася па ягоным твары». Эманацыя чысціні, прасветленасці зрабіла вялікі ўплыў на Сямёна, а праз яго ўжо і на Раю, і на Пантупчыка, і на ўсіх гарадскіх «шэфаў», якія на полі адчулі сябе свабоднымі ад умоўнасцей бюракратычнага васалітэту.

Л. Левановіч шмат увагі ў творах аддае праблеме арганізацыі індывідыумам уласнай эмацыянальнай сферы. Па-мастацку пераканаўча пісьменнік раскрывае праблему сацыяльнай і духоўнай дзеяздольнасці сучасніка ва ўсёй яе складанасці, не спяшаючыся даваць узоры ці рэцэпты выратавання. Свой клопат і абавязак пісьменніка-рэаліста ён бачыць у тым, каб дакладна азначыць узровень разумення грамадой патэнцыялу яе ўласнага духу, каб сфарміраваць патрэбу ў пераадоленні паласы зацьмення. Вельмі характэрнай у гэтым плане з'яўляецца семантыка і сімволіка невялікага шэдэўра «Кругі гало» (1991). Героі твора — беларускія вучоныя: фізікі, лірыкі, кінікі. Пажылы прафесар-гісторык Закрэўскі ўзяў на сябе місію вывесці пакаленне маладых навукоўцаў уночы на бераг лясной рачулкі, каб яны ўбачылі падвойны эфект хараства і надзеі: вогнішча на касагоры, яго адлюстраванне ў вадзе і кругі гало — вясёлку вакол месяца. Першыя абагульненні філасофскага экскурсу ў сферу хараства і гістарычнага быцця зрабіў прафесар Закрэўскі: «Калі на небе кругі гало рознакаляровыя, то на зямлі — аднаго колеру. Чырвоныя. Кроў і кроў»[17]. Аднак думка прафесара пра ахвяры закранула не ўсіх. Для Адамейкі чалавек — гэта ўвогуле «мярзотная істота». Для адзінокай Валі лепей за зорнае неба і двайное вогнішча — «зоркі ўваччу

---

[15] Левановіч Л. Поўнае зацьменне месяца // Паводка сярод зімы. Мінск, 1989. С. 374.

[16] Там жа. С. 384.

[17] Левановіч Л. Кругі гало // Сіняе лета. Мінск, 2005. С. 306.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ад кахання»: «Мела б я добрага мужа, кучу дзяцей, не было б у мяне гэткіх думак. Бязмужняя кабета — быццам незанятае таксі. Швэндаецца па свеце. Па цёмным лесе, як я... Затое убачыла кругі гало. Двайное вогнішча. Зорнае неба»[18].

Так на малой плошчы апавядання-дыспуту Л. Левановіч паспяхова ставіць і вырашае праблему ролі беларускай інтэлігенцыі ў духоўным жыцці этнасу. На сучасным этапе яна не адчувае патрэбы ў этнакансалідуючай дзейнасці. У яе няма імкнення, якое вызначыла жыццёвае крэда Еўфрасінні Полацкай, Кірыла Тураўскага, Клімента Смаляціча, аўтара «Слова пра паход Ігаравы» — бачыць свой народ згуртаваным, «яко душю едину». Чалавека на калёсах моцна трымае ў сваіх абдымках звычка «швэндацца» па свеце і лавіць падчас сустрэч імгненні забыцця, каб быць па-за працэсам рэальнай самарэалізацыі ў соцыуме.

Эстэтыка-філасофская ўстаноўка Л. Левановіча на формулу паўнацэннага існавання вывела яго на сцежку да паэтыкі сустрэч, насычанай экзістэнцыяльнымі і сацыякультурнымі сэнсамі ў прозе М. Лынькова, В. Быкава ды і многіх іншых аўтараў. М. Лынькоў у аповесці «Сустрэчы» (1940) апярэдзіў літаратурны час. Ён паказаў, што ідэалагема «ў жыцці заўсёды ёсць месца для подзвігу» вядзе толькі да катастрафічных вынікаў і ставіць пад пагрозу само існаванне этнасу. Шлях Захара Крымянца з аповесці М. Лынькова ў пэўным сэнсе паўтарыў герой драмы Л. Левановіча «Павел і Хуаніта». Прататыпам Паўла Варанецкага з'яўляецца Фадзей Варанішча, удзельнік рэвалюцыйнага руху ў Аргенціне і Іспаніі, супраціўлення — у Францыі. Гераічная самаахвярнасць выдатных адзіночак не зменіць жыццё да лепшага, калі этнас, адзначаў ужо А. Пушкін, «безмолвствует». І таму першапачатковая задача інтэлігенцыі — абудзіць у народзе патрэбу і сілу, неабходную для пераадолення знямення і поўнага зацьмення. Было б, аднак, памылкай лічыць, што Л. Левановіч спадзяецца на нейкага выключнага героя-асветніка. Адмовіўся ён і ад традыцыйнага для афіцыйнай паэтыкі канфлікту паміж наватарамі і кансерватарамі, паміж бацькамі і дзяцьмі. Рэальная фантазія скіроўвае творчы пошук аўтара на мадэляванне новых варыянтаў чалавечай сітуацыі, адлюстраванай у беларускім фальклоры і філасофскім тэатры. Купалаўская *Сам-сітуацыя* («Сон на кургане») у драматургіі Л. Левановіча малюецца як *Мы-Сам-сітуацыя*.

У п'есе «Пасля разводу» («Чысты чацвер») у ачышчальнай працы ўдзельнічаюць усе тры пакаленні адной сям'і. Унутрысямейны канфлікт у творчасці Л. Левановіча лічыцца як праява

[18] Левановіч Л. Кругі гало. С. 307.

псіхічнай анамаліі, як насланнё. У аднаактоўцы «Ці любіце вы грэчку?» брыгадзір Цімох Баркун, у брыгадзе якога не ўзышла грэчка, шчыра клапоціцца пра ўратаванне глебы, чаго нельга сказаць пра агранома. Праўда, нечаканыя павароты і перажыванні персанажаў у драматургіі Л. Левановіча недастаткова дэтэрмінаваны. Нацяжкай можна лічыць высакародныя эмоцыі Трухана («Чабор»), ускосна вінаватага ў гібелі свайго сына і суседа. Аднак пры гэтым трэба ўлічыць аўтарскую задуму — заўсёды і ўсюды шукаць і знаходзіць духоўны патэнцыял этнасу, яго здольнасць да самаачышчэння і самасцвярджэння ў сучасным чалавецтве — не толькі людзьмі быць у сабе і для сябе, але і людзьмі звацца. Стыхійна, аднак, без дасведчаных і ўмелых кіраўнікоў такія праблемы не вырашаюцца. Драматургічны вопыт Л. Левановіча пераконвае (перш за ўсё — самога аўтара) у тым, што карціна пераадолення высокага перавалу на гістарычнай дарозе этнасу ў будучыню можа быць праўдзіва паказана толькі ў жанравых формах трагедыйнага канону, да ўспрымання якога павінна быць падрыхтавана грамадская свядомасць.

У аповесці «Ларыса, альбо Каханне аўтамабіліста» аўтар перакануча паказаў, што беларуская інтэлігенцыя, з'явіўшыся на паверхні сацыяльнага жыцця ў канцы XX ст., яшчэ не вырасла да таго стану, які ў псіхааналізе К. Чорнага названы абвостранай цвёрдасцю і здольнасцю да непераможнай дзейнасці.

Мовазнавец Павел Ісачонак у неспрыяльных для навуковай творчасці сучасных умовах пасля смерці жонкі нават страціў волю да жыцця. Сустрэча з Ларысай дапамагла яму выйсці са стану дэпрэсіі, але ён адчувае сябе бездапаможным перад тымі істотнымі пытаннямі, з якімі да яго звяртаецца моладзь. Адчуваецца, што мовазнаўцу Паўлу Ісачонку ў часы партыйнай дыктатуры не было патрэбы звяртацца да мовазнаўчай гіпотэзы Э. Сэпіра і Б. Уорфа, яфецідалогіі Н. Мара, аналітычнай (лінгвістычнай) філасофіі Аўстрыйскага гуртка, паэталогіі нямецкіх і беларускіх рамантыкаў. Аднак інстынктыўнае адчуванне каштоўнасных сэнсаў беларускай вербальнай культуры забяспечвае Паўла магчымасцю паспяхова прайсці выпрабаванні на жыццяздольнасць паміж Сцылай і Харыбдай сучаснаснай цывілізацыі. Экстэнсійны вопыт сялянскай субкультуры падказвае яму, што для самавызначэння беларусаў істотнае значэнне мае самастойнае асэнсаванне сутнасці сучаснага рацыяналізму, яго амерыканскай і кітайскай мадэляў, што сферу чалавечага жыццядзеяння — і найперш духоўнага — нельга абмежаваць лагістыкай. Азначаная інтэнцыя — гэта хутчэй яшчэ неўсвядомлены імпульс у беларускага мовазнаўца.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У творчасці ж празаіка Л. Левановіча гэты імпульс ужо рэіфікаваны (урэчаўлёны) у вобразе шляху, які пачынаўся на берагах празрыстай Бесядзі і закончыўся зонай адсялення. Гэта — калі браць беларускі варыянт. У эсэістыцы з кнігі «Усмешлівая Амерыка» Л. Левановіч спрабуе зазірнуць і ў залюстроўе заходняй, даўно рассяляненай цывілізацыі. У таталітарных рэжымах Вал трымае ў зняволенні чалавека, у ліберальным грамадстве ў персанальнае валоданне трапіла жыццятворная сіла прыроды. Універсальнай формай адпрэчання прыроды ад чалавека ў аповедзе-былі «Пацалунак марскога льва» з'яўляецца *акварыум*: «У гэтай ёмкасці зроблены скалы, пячоры, падводныя рыфы. Калі ўключаюць святло па баках, рыбы ажываюць, усе насельнікі быццам выплываюць на парад»[19]. У вінтавой сцяне пляцоўкі акварыума «...быццам уманціраваны дзесяткі акварыумаў рознай формы і памераў; па адным, па два метры. І там віруе жыццё <...>»[20].

Акваторная сімволіка Л. Левановіча з'яўляецца лагічным працягам анталагічных сэнсаў яго цалiннай і падводнай сімволікі папярэдніх твораў і ўзбагачае семантыку характэрнага для беларускай літаратуры жанру алюзіі. Семантычны рад сімволікі цырку, заапарку, тэатру Л. Левановіч узбагаціў семантыкай універсальнага сімвала дрэсіроўкі-акварыуму. Гэты вобраз успрымаецца з асаблівай сілай на фоне ўспамінаў пра час, калі само сузіранне прыроды было вышэйшай каштоўнасцю, чым яе пакарэнне: «Ляжыш, бывала, на беразе Бесядзі, унізе глыбокі вір. Вада такая чыстая, што відзён кожны каменьчык ці якая чарапашка». Заснаваная на фальклорнай натурфіласофіі, эстэтыка беларускага слова ў творчасці Л. Левановіча паступова пашырае свае магчымасці ў сферы сацыяльнага і духоўнага жыццядзеяння беларускага соцыуму, вяртання ў жыццё народных ідэалаў у іх першароднай чысціні і сіле.

Раманы Л. Левановіча арганічна далучаюцца да той плыні ў культуры Падняпроўя, якая ў творах В. Бялыніцкага-Бірулі, Г. Вашчанкі, А. Бархаткова, В. Карамазава, А. Пісьмянкова адлюстравала непарыўную повязь чалавека з роднай прасторай, з рэчавым светам. «Ціхая» плынь у мастацкай культуры Падняпроўя валодае нерастрачанай сілай тварэння і ўпарадкавання культурнай прасторы. Адцэнтрабежная дынаміка тут разумеецца як зваротны рух ужо ачалавечанай, адухоўленай энергіі Сусвету, скіраванай на тварэнне і захаванне «свету аднаго» — сусветнай цэласнасці і раўнавагі.

[19] Левановіч Л. Пацалунак марскога льва // Усмешлівая Амерыка. Мінск, 2005. С. 22.

[20] Там жа. С. 23.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Менавіта такая перспектыва, як мэта і сэнс жыццядзеяння, бачыцца з першых старонак «пасцікніжжа» Л. Левановіча. Сімвалічную прыўзнятасць мае ўжо сцэна абуджэння і вяртання з цяжкага сну да рэчаіснасці Андрэйкі, хлопчыка з вогненнай вёскі, у самым пачатку рамана «Шчыглы». Праз акно сялянскай хаты пісьменніку бачыцца панарамная карціна беларускага быцця ў XX ст., намаляваная сродкамі вербальнага жывапісу: «Андрэйка зірнуў у акно і здзівіўся: неба за Бесяддзю дрыгатліва ўспыхвала, было яно густа-барвовае, як набрынялае крывёю, над зубчатым грэбнем лесу поўз, быццам туман, сівы дым. Андрэйку зрабілася вусцішна, слёзы самі навярнуліся на вочы»[21].

У рамане «Шчыглы» Л. Левановіч паказвае, як у адказ на выклікі «пустога часу» фарміруюцца запыты пакалення, сталенне якога адбывалася пасля сутычкі гітлерызму са сталінізмам. У памяці Андрэйкі бабуля Васіліса засталася такой, якой ён убачыў яе ў дзень смерці: «Бабуля нагадвала нейкую нябачную лугавую краску, адрэзаную касою і таму ўсохлую, зжаўцелую»[22]. Гэта фраза можа быць успрынята як мастацкая аўтаномная мініяцюра — квантэмная каштоўнасная ацэнка жыцця аднаго са страчаных пакаленняў. Забіваючы ржавымі цвікамі труну, стары Гылігор успомніў часіну, калі ў ранняй маладосці Васіліса цвіла, «што макаў цвет». Тады да яе і пасватаўся Патап, у будучыні — Андрэйкаў дзед, пра якога ўнук ведае толькі тое, што чуў некалі ад старэйшага брата Колькі. Перад вачыма паўстае толькі сілуэт вобраза: «З бародкай сіваенькай быў. З кійком хадзіў». Л. Левановіч фарміруе асацыятыўна-сэнсавы рад мэтанакіравана, захоўваючы належны рытм мастацкай рэцэпцыі. Ціхае жыццё і ціхая смерць бабулі Васілісы сталі для Андрэйкі вялікім урокам чалавечай самаахвярнасці і годнасці. Вернай самой сабе і таму няпісанаму кодэксу грамадоўскай, абшчыннай маралі заставалася бабуля і тады, калі, знясіленая, не магла ўжо выйсці з палаючай хаты, калі нетыповы немец вынес яе і пакінуў паміраць у агародзе, далей ад агню. Андрэйкава пакаленне не чула ў маленстве «легендаў і казак былых пакаленняў» з вуснаў мудрых дзядоў. Чалавечую годнасць продкаў яно ўспрымала на іх смяротных рубяжах.

Бацькі, заціснутыя падчас калектывізацыі ў кулаку чырвонай бюракратыі, таксама не змаглі раскрыць свой праект сялянскай ідыліі. Не было нават магчымасці вынесці на паказ сваю крыўду ўсю. Бацькі вымушаны былі забыць свае ідэалы і замкнуць свае вусны пры жыцці: «І малатаркі шкода. І коней шкода, — ледзь

[21] Левановіч Л. Шчыглы: раман. Мінск, 1986. С. 3.
[22] Там жа. С. 40.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

не са слязьмі ў голасе гаварыў Мацвей. — А галава, братка, даражэй... Сям'я, дзеці...»[23]

Так падводзяць вынікі асэнсавання сітуацыі занесеныя ў спісы на раскулачванне і высяленне Мацвей Сахута і Макар Казакевіч («Паводка сярод зімы»). Антон Пракапенка, будучы старшынёй Лабанаўскага райвыканкама, аддаваў перавагу няпісанаму закону людскасці, з якім усё ж немагчыма было паяднаць патрабаванні партыйнай бюракратычнай мудрасці, што ў год «вялікага пералому» (1929) была скандэнсавана «в один громящий кулак». Дабратворны ўплыў беларускай народнай мудрасці адчувае часам і сакратар райкама партыі Акапян — калі ён пакідае свой кабінет і ідзе да людзей. Так было на лесапавале зімой.

Л. Левановіча, аднак, больш цікавяць жывыя праявы, чым вытокі народнай жыццяздольнасці. Празаік вылучае асноўныя тыпы носьбітаў і захавальнікаў народнай мудрасці ў Хатынічах — філасофіі існавання, сацыяльнай філасофіі і фенаменалагічнай фальклорнай эстэтыкі. Названыя формы народнай аксіялогіі існуюць у сінкрэтычнай форме — як культура «на штодзень». Яе носьбітамі з'яўляюцца вобразы бабулі Васілісы, старога Гылігора, Макара Казакевіча, Кацярыны і Мацвея Сахутаў. Л. Левановіч спецыяльна не завастрае ўвагі на пераемнасці і трансляцыі гуманістычных традыцый духоўнай і сацыяльнай культуры продкаў, але з рамана ў раман нарастае ў яго «шасцікніжжы» трывога за «пласты народнай жыццяздольнасці» (К. Чорны) рассялянёнага пакалення вёскі.

Макар вярнуўся з сусветнага крывавага месіва са скалечаным, няпоўным целам, але яго дух па-ранейшаму жыў патрэбай «майстраваць нешта». «Нешта» ў разуменні беларускага селяніна — гэта ўсё тое, што адпавядае яго разуменню людскасці, норме «паміраць збіраешся, а жыта сей». Рацыянальны праект будучыні Казакевіча нагадвае канцэпцыю арыстоцелеўскай палітэі, сацыялогасу, які дзейнічае ў адпаведнасці з законамі народнай натурфіласофіі, як «у прыродзе заведзена». Светасузіранне Мацвея Сахуты з яго схільнасцю да дасканалення духоўнай сферы адшукання і ўсталявання ідэалу дабра нагадвае стыхійны варыянт беларускага народнага платанізму. Знайшоўшы рулон тканіны, Сахута шукае і знаходзіць таго крамніка, які праз свой недагляд можа быць асуджаны за растрату. Свайго здольнага да вучобы Андрэйку Мацвей хацеў бы ў сталасці бачыць ляснічым. Гэта пасада, на думку Мацвея, дае чалавеку магчымасці свабоднага і забяспечанага існавання ў згодзе з законам. Эталонам руху да сонца

[23] Левановіч Л. Паводка сярод зімы. С. 53.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

для Мацвея, як і для бабкі Мар'і з трылогіі Я. Коласа «На ростанях», з'яўляецца дрэва. Новы садок каля хаты Мацвей садзіў разам з Андрэйкам: «Ты прыкмячай усё, вучыся. Мяне бацька некалі вучыў». Андрэйка на ўсё жыццё запомніў, як бацька кожную яблыньку апускаў карэннямі ў разбаўтаную гліну, прыпадымаў, прысыпаную, угару, «каб не было там пустаты». Побытавая сітуацыя закладкі саду каля хаты вырастае ў сімвалічны вобраз пераадолення пустотнага часу: «Андрэйка таксама прыціх, ён думаў са шкадаваннем, што рана памёр дзед, і другога дзеда — матчынага бацьку — ён не ведаў. Толькі помніў бабку Васілісу, матчыну маці, ды і то ні разу не пагаварыў з ёй, а мо і гаварыў, ды забыўся. Затое пахаванне яе — а яна памерла, калі прагналі немцаў, урэзалася ў памяць назаўсёды»[24].

Дзве мадэлі народнай філасофіі, увасобленыя ў вобразах Макара і Мацвея, сваім вытокам маюць мастацкі канцэпт *шлях*, у беларускай літаратуры надзвычай насычаны інтэлектуальнай і эмацыянальнай інфармацыяй. Семантыка жыццёвага шляху ў беларускай народнай культуры ўвасоблена ў сімволіцы ручніка. Мастацкай аналогіяй ручніка ў рамане «Паводка сярод зімы» з'яўляюцца вытканыя з кужалю палотны, якія вымочваліся і рассціладіся на паплавах пад сонцам. Гэта праца была ганаровым абавязкам падлеткаў: дарослыя ад цямна да цямна працавалі на сенажаці ці ў полі.

Л. Леановіча хвалюе праблема гістарычнай дзеяздольнасці герояў яго раманаў. Пісьменнік даследуе ўзровень асэнсавання народнай думкай гістарычнага шляху нацыі. Пытанні сэнсу гісторыі паўстаюць раней ці пазней перад усімі персанажамі яго раманаў, акрамя партыйных функцыянераў, якім дазволена думаць толькі пра выкананне планаў паставак, нарыхтоўкі, дзяржаўнай пазыкі, перавыкананне заданняў на пяцігодку за чатыры гады. Настаўнік Пётр Мамута ў гутарках са старым археолагам спрабуе ўзняць заслону часу, аднак тая праца філасофскага пазнання патаемнага сэнсу быцця, якая была ўласціва героям Я. Коласа і М. Гарэцкага, новым пакаленнем вясковага настаўніцтва ў сярэдзіне XX ст. была страчана, выцеснена сублімацыяй асветніцкай дзейнасці — прапагандай пастаноў, прынятых партыйным кіраўніцтвам.

На першы погляд можа паказацца, што пасляваенная вёска, паказаная ў раманах Л. Левановіча, абяскроўленая і галодная, ужо вычарпала свае духоўныя і інтэлектуальныя рэсурсы, што ў вяскоўцаў захавалася толькі здольнасць да цярплівасці і гатоўнасць

---

[24] Левановіч Л. Паводка сярод зімы. С. 27.

упрэгчыся ў ярмо ці ў хамут замест страчаных валоў і коней. У душы Мацвея і Капярыны пасля перажытых страт ужо нібыта нічога і не засталося. Мары, надзеі, думкі і нават пакуты сплылі ў вечнасць разам з нябачнымі свету слязьмі. Аднак жа Л. Левановіч нейкім унутраным зрокам бачыць ісціну і сутнасць не толькі у стратах. Дыялектыку пераадолення паласы спустошання пісьменнік адлюстроўвае не ў формах барацьбы супярэчнасцей, а як дынаміку плана іманентнасці.

Л. Левановіч умее паказаць магчымасць будучыні, якая вырастае з сучаснасці — як расліна з зерня. Інстынктыўна на традыцыйныя нацыянальныя каштоўнасці арыентуюцца людзі ў тых калгасах Лабанаўскага раёна, дзе на пасады старшыняў былі выбраны пад апекай Антона Пракапенкі кіраўнікі з традыцыйнай гаспадарскай арыентацыяй. Макар Казакевіч з фронту прыйшоў без нагі, але ён памог сваім людзям стаць на ногі: вярнуцца з зямлянак — пячэраў пасляваеннага часу — у светлыя хаты, пасадзіць каля хатаў сады, пабудаваць уласную электрастанцыю. Мікалай Раковіч, старшыня калгаса «Радзіма», таксама з вайны прыйшоў «аднабокім», з абсечаным левым плячом, але гэта не перашкодзіла яму ўзяць на ўцалелае правае плячо двайны клопат — не толькі пра бульбу і хлеб, малако і мяса, але і пра клуб і бібліятэку. Клуб — «хай сабе аднапавярховы, драўляны, але даволі вялікі, прасторны: ёсць глядзельная зала, пакой для заняткаў гурткоў, а ў другой палавіне размясцілася бібліятэка»[25] — старшыня лічыў адным з важнейшых дасягненняў у пасляваенным адраджэнні сваёй вёскі. Клуб і бібліятэка для Раковіча былі такой жа ўцехай, як электрастанцыя і святло ў хатах для Казакевіча.

Выдатнай знаходкай у творчым пошуку Л. Левановіча ў савецкай залюстэркавай рэальнасці з'яўляецца мастацкі канцэпт *жалезны кулак*. «Жалезны кулак» нарыхтоўшчыка Паўла Крупадзёрава ў прозе Л. Левановіча жыве нейкім аўтаномным жыццём, як ганарысты чыноўніцкі нос ў аднайменным апавяданні М. Гогаля ці як галава, а то часам толькі адна ўсмешка Чашырскага ката ў аповесці Л. Кэрала «Аліса ў краіне цудаў». Малапісьменны сялянскі хлопец хутка ўцяміў свае магчымасці ў сітуацыі ліквідатарскай актыўнасці новай улады: вызначыцца можна, знішчаючы ўсё існае, але пад лозунгамі будаўніцтва новага свету. Ідэя ж новага рэалізуецца ў датэрміновым выкананні даведзеных планаў нарыхтовак і паставак.

Шматаблічная тыпалогія партыйна-савецкага нарыхтоўчага кулака ў раманах Л. Левановіча паказана ў гістарычнай дынамі-

[25] Левановіч Л. Сіняе лета. Мінск, 2003.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цы. Своеасаблівым двайнікам Паўла Крупадзёрава праз усе раманы праходзіць вобраз Валодзькі Бравусава. У войска ён ужо трапіў неабцяжараны той адказнасцю за жыццё, з якой у душы ідуць па дарогах жыцця-вайны Мацвей Сахута і Макар Казакевіч. Займеўшы ў партызанскім атрадзе ўладу камандзіра ўзвода і зброю, юны Бравусаў гатоў быў пусціць у расход любога, хто трапляў яму пад адпаведны настрой. Звычка дзейнічаць нахрапіста і з прымяненнем зброі стала дамінуючым комплексам у псіхіцы Бравусава. Ад нахрапістасці ён не адмаўляецца нават у інтымных адносінах. Валодзька натварыў бы шмат бяды, калі б яго імпэт не стрымлівалі начальнік міліцыі Гоманаў і пракурор Ясючэня.

Яны — таксама «усечаныя» інваліды вайны. Іх размовы з Бравусавым таксама нагадваюць пра тыя чалавечыя сэнсы народнай культуры, якія закладзены ў выказваннях Гылігора, Мацвея, Казакевіча. Л. Левановіч мае зоркае вока на сховы беларускай людскасці і знаходзіць яе ўсюды, дзе працуюць рэкруты старой беларускай вёскі. У пракуратуры і міліцыі — таксама. І ўсё ж пісьменнік не спяшаецца паказваць абсалютны трыумф дабра, перамогу над злом ці тым больш хуткае «перавыхаванне» герояў. Бравусаў не можа самастойна арганізаваць сваё ўнутранае жыццё, яго паводзіны заўсёды сітуацыйна залежныя.

Тое самае можна сказаць і пра старшыню сельсавета Рамана Свідэрскага, чалавечае падзенне якога пачалося з публікацыі адрачэння ад свайго бацькі, пазней раскулачанага і высланага з роднай вёскі. З гэтага часу духоўныя сілы камсамольца Свідэрскага былі падпарадкаваны адной мэце — выкананню даведзеных планаў паставак мяса, малака, воўны, скуры, яек, падатковых збораў, пазыкі, вывазу лесаматэрыялаў. Істотнае месца ў рабоце старшыні меў клопат пра знішчэнне самагонных апаратаў, арганізацыю пажарнай бяспекі, нагляднай агітацыі. Свідэрскі апынуўся ў стане перманентнай вайны са сваімі людзьмі. Яго жыццёвыя патрэбы — духоўныя і матэрыяльныя — былі рэдуцыраваны да апошняй мяжы. У пошуках ісціны Свідэрскі прыйшоў да кіраўніка баптысцкай царквы, але размовы з прыхільнікамі «штунды», людзьмі, гаспадарлівымі і дабрадзейнымі ў сваім коле, не далі спатолі выпусташанаму Свідэрскаму: пастар прапанаваў яму дактрыну, а яго скалечанай душы патрэбен быў свой ідэал, якому ён здрадзіў у маладосці. У стане цяжкай дэпрэсіі псіхіка Свідэрскага знайшла выйсце з тупіка ў забойстве жонкі і самагубстве.

Л. Левановіч сродкамі сацыяльна-псіхалагічнага аналізу стварае новыя мадыфікацыі канцэптуальных персанажаў, адкрытых у беларускай міфалогіі і фальклоры, па сваіх мастацкіх ёмкасцях

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

роўнавялікіх канцэптуальным персанажам у раманах Ф. Дастаеўскага. У беларускай літаратуры — гэта выразна відаць на фоне рускай класікі — не абсалютызуецца роля пакаяння ў справе рэабілітацыі забойцаў, «мальчики кровавые в глазах» у іх не стаяць. Такі ракурс у нацыянальнай школе псіхааналізу выводзіць думку на паверхню перспектыўных пошукаў у галіне сацыяльнай філасофіі актуальнага часу. Вербальнае афармленне першай па значнасці задачы ў гэтым напрамку мыслядзеяння было зроблена І. Мележам у форме запыту, а па сутнасці — выкліку, кінутага афіцыёзу: «Куды вядуць дарогі?». Прыём рэпрызы, характэрны для кампазіцыі раманаў Л. Левановіча, з'яўляецца фармальным момантам у структураванні хранікальна цэласнай карціны быцця і адначасова нагружаным кампанентам. Учыненае старшынёй сельсавета нематываванае забойства ў сваёй сям'і і яго самагубства не стала для кіраўнікоў Лабанаўскага лакальнага соцыуму пачаткам пераасэнсавання курсу на дэструкцыю. Гвалтоўная смерць нарыхтоўнічыка і па сумяшчальніцтве крымінальніка Крупадзёрава, які выславіўся сваім жалезным кулаком, падчас сяброўскай выпіўкі з былым ахоўнікам парадку Бравусавым засталася як бы і не заўважанай. Забойства былога пасля Свідэрскага старшыні сельсавета Сырадоева, учыненае некалі чулым і далікатным трактарыстам, а потым алкаголікам Варонiным, і яго самазабойства было паўтарэннем трагічнага комплексу Свідэрскага ў новым пакаленні. У асяроддзі мясцовых кіраўнікоў і інтэлектуалаў (дакладней — ідэолагаў) ніхто не звярнуў увагі на заканамернасць дэструкцыі ў соцыуме і псіхіцы асобы, ніхто не падумаў, куды ж усё-такі вядуць нас абраныя начальнікамі дарогі.

У раманах «Сіняе лета», «Бесядзь цячэ ў акіян» і «Палыновы вецер» Л. Левановіч паказвае павярхоўны характар змен у кіраўнічай і гаспадарчай дзейнасці, названых у часы М. Хрушчова рэформамі. Узбуйненне калгасаў не спыніла працэсаў дэградацыі вясковага жыцця. У рассяляненай і абязлюджанай вёсцы нібы самі сабой зніклі элементы дэмакратыі, прадугледжаныя Статутам сельгасарцелі. Крытэрый адказнасці кіраўніцтва за маральнаэтычны ўзровень супольнасці ў цэлым і свой уласны дамінуе і ў другой палове напісанага Л. Левановічам «шасцікніжжа». Выходзячы на праблему маральнага фактару ў кіраўнічай дзейнасці актуальнага часу, пісьменнік знаходзіць жывыя крыніцы дзяржаўнай і палітычнай мудрасці нацыі, якія на працягу стагоддзяў намагаюцца «з глебы на прастор прабіцца» і заўсёды супрацьстаяць крупадзёраўшчыне на ўсіх узроўнях уладнай структуры. На Антона Пракапенку на пачатку яго кіраўнічай дзейнасці ў раёне



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

моцнае ўражанне зрабіла асоба сакратара райкама Змітровіча. Выступленні яго вылучаліся веданнем і глыбокім разуменнем сітуацыі ў краіне і раёне: «І ўсё гэта было сказана на жывой, не казённай, роднай мове. Імпанавала манера гаварыць, выступаць: простая, адкрытая, быццам гутарка з таварышамі па партыі, ні гучных заклікаў, ні пышных фраз»[26].

За такія праявы людскасці сакратару райкама быў навешаны ярлык нацдэма, што было на той час раўнасільна абвінавачванню ў варожай дзейнасці. Змітровіч загінуў у ГУЛАГу, але народны стыль яго кіраўнічай дзейнасці застаўся ў памяці Пракапенкі на ўсё жыццё. Гэта быў стыль палітычнай культуры, якая не вывучалася на курсах партактыву, але сама арганічна вырастала на глебе агульначалавечых каштоўнасцей народнай культуры. У савецкія структуры пазнейшага часу яна пранікала ў форме стыхійнага валенрадызму. Лугаўцоў, Пракапенка, Якубеня, Чэпікаў, Казакевіч, Раковіч дзейнічаюць нібыта самі па сабе, фармальна арганізаваная сістэма больш прыцiскае, чым яднае, і таму кожны з іх рэалізуе сябе як сацыяльная асоба па-за нарматывам «давай-давай, шуруй-шуруй».

Вобразы Змітровіча і Пракапенкі прадоўжылі галерэю тых народных інтэлігентаў, якія ў бюракратычнай сістэме абесчалавечвання кіраваліся пачуццём роднасці са сваімі людзьмі. У «шасцікніжжы» Л. Левановіча эстафета беларускага нацыянал-камунізму заканчваецца трагічным фіналам Пятра Машэрава.

Раман Л. Левановіча «Бесядзь цячэ ў акіян» пачынаецца тэлефоннай размовай А. Касыгіна з П. Машэравым. Старшыня саюзнага ўрада шукаў надзейнага пераемніка і ў Беларусі бачыў немалыя рэсурсы чалавечага патэнцыялу на агульнасаюзную карысць. Гаворка ішла пра магчымы перавод П. Машэрава на пасаду старшыні саюзнага ўрада пасля А. Касыгіна. Іншыя планы, аднак, выспявалі ў коле «крамлёўскіх дзядоў», што групаваліся вакол генсека Л. Брэжнева. Ніякіх рэформ яны праводзіць не збіраліся. Тэлефонны званок Л. Брэжнева П. Машэраву ўспрымаецца ў рамане як папярэджанне харызматычнаму беларускаму кіраўніку. Складваецца ўражанне, што П. Машэраў у рамане Л. Левановіча як бы прадчувае свой немінучы трагічны фінал.

У рамане «Бесядзь цячэ ў акіян» падкрэсліваецца актуальная неабходнасць паглыбленага асэнсавання дзяржаўнага і грамадскага жыцця ў Беларусі пасля гібелі П. Машэрава, раскрываецца карціна дэградацыі высокапастаўленых партыйных функцыянераў, няздатных мысліць у нацыянальна-дзяржаўных маштабах.

---

[26] Левановіч Л. Дзікая ружа. Мінск, 1993. С. 195.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Кар'ерныя інтарэсы, грызня за пасаду сталі мэтай і сэнсам дзейнасці чыноўнікаў на ўсіх узроўнях наменклатурнай вертыкалі. Абвострана адчувае пераломны момант гісторыі новае пакаленне лабанаўскіх «раёншчыкаў», якіх яднае на дзіва жывучая традыцыя гуртовай і гаспадарскай парадыгмы Прыбяседдзя. Яны паспрабавалі адразу ж пасля паніхіды асэнсаваць сацыяльна-палітычную сітуацыю ў рэспубліцы.

Раман «Палыновы вецер» з'яўляецца своеасаблівым разгорнутым сімвалам — падсумаваннем вынікаў сацыялістычнага будаўніцтва, сэнс якога А. Платонаў азначыў канцэптам *катлаван* у сваім аднайменным рамане. У «Палыновым ветры» Л. Левановіч часта звяртаецца да рэтраспектыўнага паказу сацыяльнай і духоўнай рэальнасці на пачатку вялікага сацыяльнага эксперыменту, калі толькі рыхтаваўся катлаван пад фундамент сталінскага сацыялізму. Даўно перажытае вяртаецца аўтарам у кантэкст актуальнага часу, становіцца аб'ектам рэфлексіі. Гэтым самым у творы рэабілітуецца сучаснасць, занядбаная дзеля «светлай» будучыні, аднаўляецца плынь гісторыі. Ідэалогія сучаснага «пераходнага» перыяду стараецца трымаць грамадскую свядомасць на ўзроўні патрэбы выжывання, свядома забываючы пра якасны ўзровень чалавечага існавання. Л. Левановіч скіроўвае інтэлектуальную актыўнасць чытача на вырашэнне праблемы дзеяздольнасці нацыі ў пошуках выйсця з тупіковай сітуацыі трагічнага абсурду.

У Андрэя Сахуты падчас яго роздумаў у асуджаных на небыццё пасля Чарнобыльскай катастрофы Хатынічах аднаўляецца здольнасць мысліць самастойна. У такія моманты яго думка часта сягае за межы кругагляду, які быў дазволены партыйнаму функцыянеру. Ён спрабуе ўбачыць варыянты свайго лёсу праз прызму няздзейсненага альтэрнатыўнага варыянту еўрапейскай гісторыі.

Л. Левановіч непрыкметна падводзіць чытача да спасціжэння дзеяздольнасці сучаснай інтэлігенцыі ў фарміраванні культурнага працэсу. Аўтар плённа выкарыстоўвае патэнцыял мінімалізму. Ланцуг семіятычнай логікі ў яго «шасцікніжжы» ствараецца паэтыкай эпізодаў, сярод якіх пераважаюць сустрэчы. Персанажы звычайна сустракаюцца двойчы. Першая сустрэча прыадкрывае выбуховы патэнцыял рэчаіснасці, а другая — часцей за ўсё пярэдадзень трагедыі.

Паэтыка сустрэчы заўсёды была сэнсава насычанай у сюжэтах класічнага фальклору. У мінімалізме М. Лынькова сустрэчы сталі працягам *этапавай* паэтыкі Ф. Багушэвіча і М. Танка. Л. Левановіч прапануе чытачу ўстанавіць супольнымі намагання-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мі логіку сэнсаў у сустрэчах, якія сталі стылем сучаснага жыцця на розных яго сацыяльных узроўнях. Больш за ўсё аўтара хвалюе праблема сустрэчы і ўзаемапаразуменне *сваёй* палітычнай (ідэалагічнай) інтэлігенцыі са *сваім* народам: пагроза трансфармацыі культурнай прасторы ў зону сёння стала сацыяльнай рэальнасцю.

Культурныя сэнсы дзвюх сустрэч Андрэя Сахуты і Косці Вароніна, гадаванцаў напалову спаленай фашыстамі і галоднай, але адноўленай, а потым атручанай радыёнуклідамі вёскі Хатынічы, выходзяць далёка за межы лакальнай праблематыкі. Семіятычная логіка гэтага матыву ў рамане «Палыновы вецер» выводзіць аналітычную думку на праблему пераадолення хваравітага стану, уласцівага інтэлігенцыі, ізаляванай ад сацыяльных рэалій веку.

Л. Левановіч у сваім «шасцікніжжы» настойліва шукае сваё месца ў агульнай карціне сучаснага мастацка-кагнітыўнага і філасофскага пошуку. Пісьменніка хвалюе лёс інтэлектуальнага і духоўнага скарбу, назапашанага на працягу тысячагоддзяў у беларускай культуры каляндарна-земляробчага тыпу. Пра пагрозу яго страты гаварыў Я. Колас у паэтычнай прадмове да паэмы «Сымон-музыка», якую аўтар прысвяціў беларускай моладзі.

Топас *на зломе* (Я. Нёманскі) у 1920-х гадах быў па сэнсе блізкі да чорнай магіі залому ў фальклоры, які ў паэзіі Я. Купалы стаў сацыяльнай характарыстыкай актуальнага беларускага часу і цывілізацыйнага крызісу наогул. К. Чорны ўжо ў 1920-х гадах адчуў пагрозу ціхага скапання. Карціна сцякання і сплывання, характэрная для філасофскіх медытацый пасляваеннага часу, у прозе Л. Левановіча ўспрымаецца як *спаўзанне* і павольнае падзенне ў яму. Апошнім Косцевым прытулкам быў стажок духмянага сена са смяротнымі нуклідамі. Пасля двух стрэлаў Косці Вароніна, якімі ён спыніў жыццё-спаўзанне Сырадоева і ўласнае жыццё-падзенне, Андрэй Сахута «ў глыбіні душы адчуваў сябе вінаватым, хоць растлумачыць сабе гэтую віну не мог»[27]. Былы абкамаўскі сакратар па ідэалогіі не мае акрэсленай думкі не толькі пра сваю віну перад Косцем, але і пра ўласныя прыступы суіцыдальных і ўсялякіх іншых, выпадковых настрояў і памкненняў, бо няма ў яго выразнай думкі пра галоўнае. Няма нават цікавасці да таго «ўніверсальнага» (заломнага) пытання, да якога ён так блізка падышоў, калі вучыўся ў першым народным універсітэце яшчэ да наведвання пачатковай школы. Дзед Гылігор нават яго папярэджваў, каб не стараўся падняць усё адразу, каб

[27] Левановіч Л. Палыновы вецер. Мінск, 2009. С. 194.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГПУ

не надарваўся. А выйшла якраз наадварот: душа і інтэлект Андрэя Сахуты на працягу дзесяцігоддзяў чэзлі ў бяздзейнасці на камсамольскай і партыйнай рабоце. «Цёмныя» вяскоўцы некалі бачылі Андрэйку ў будучыні не чыноўнікам, а «прахвесарам» — сваім культурным лідарам. Такім яго і цяпер бачыць Косця Варонін. Пасля трагічнай развязкі Андрэй падсвядома адчуў, што ён не спраўдзіў спадзяванняў сваіх аднавяскоўцаў. Успамін пра апошнюю сустрэчу з Косцем абудзіў у яго пачуццё віны. У гэтым бачыцца крок беларускага інтэлігента да пакаяння перад сваім народам за «нясплачаны доўг векавы» (Я. Колас).

Рэтраспектыва ў прозе Л. Левановіча адлюстроўвае рэальны ўзровень патрыятычнай свядомасці і суверэннасці асобы сучаснага інтэлігента, які ў лепшыя свае гады меў кармленне з наменклатурнай рукі. Здавалася, што нацыя даўно пакінула ў мінулым ваганні на ростанях і час выбару. Аднак партыйна-дзяржаўная ідэалогія вярнула нацыянальную самасвядомасць інтэлігенцыі на ўзровень імперска-манархісцкіх комплексаў. Перанастройка на суверэннае жыццё пакалення, якое латэнтна ўспрыняло яшчэ дзейныя базавыя каштоўнасці роду і вясковай грамады, але не мела магчымасці ацаніць іх значэнне ў сучасным свеце і рэалізаваць у сацыяльнай практыцы, — ідзе запаволена. У збеднелай культурнай памяці функцыянераў няма вопыту гістарычнай самарэалізацыі продкаў. Людзі, якія на парозе свайго грамадзянскага сталення сышлі з цвёрдага грунту *мужыцкай праўды* і апынуліся на дрыгвяністым балоце прыдуманай хворым розумам хіліясцкай ідэалогіі, самі маюць патрэбу ў дапамозе і падтрымцы.

Выкінуты з абкамаўскага крэсла Андрэй Сахута вобмацкам шукае дарогу праўды і ўжо на схіле веку пачынае разумець духоўныя сэнсы беларускай культуры XX ст., якая на ранейшай пасадзе была яму не патрэбна, як і родная мова. У раманах Л. Левановіча фарміруецца сацыяльна-філасофскі візаж — карціна руху пакаленняў, сэнс якой нагадвае трагічную сітуацыю ў вядомай філасофскай карціне П. Брэйгеля: сляпыя правадыры вядуць сляпых жабракоў і першыя валяцца ў яму.

Пісьменніка цікавіць воля і здольнасць звычайнага чалавека да ўзвышэння і пераадолення паласы чалавечага быцця, якую на беларускай духоўнай і сацыяльнай ніве доўгі час апрацоўвалі носьбіты сусветнага зла, увасобленага ў канцэптуальных персанажах Цмока, Вялікага злодзея, Свінтуса-Грандыёзуса, Жалезнага звера, Вала, Плана. У раманах Л. Левановіча станоўчая дынаміка не фарміруецца, а толькі выспявае. У канцы рамана «Палыновы вецер» мы бачым першыя спробы маналагічнага выказвання. На подступах да ўзвышэння ўжо знаходзяцца былы



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

настаўнік Пётр Мамута і былы ідэолаг абласнога рангу Андрэй Сахута. Свядома шукае шлях да актыўнай грамадскай дзейнасці Пётр Махавікоў. Узвышаныя пачуцці персанажы Л. Левановіча перажываюць тады, калі застаюцца сам-насам з родным з маленства краявідам. Вызвалены ад прывілеяў партыйнага функцыянера, Андрэй Сахута вяртае сабе здольнасць бачыць уласнымі вачыма аблічча роднай зямлі і разам з тым плён свайго ідэалагічнага кіраўніцтва.

У раманах «Сіняе лета», «Бясядзь плыве ў акіян» і «Палыновы вецер» упершыню ў беларускай літаратуры паказана залева «сексуальнай магіі», свабоднай ад палавой любві, ад думак і клопатаў пра лёс «трэцяга пакалення». Л. Левановіч, такім чынам, паказвае сітуацыю, у якой беларуская інтэлігенцыя пастаўлена перад экзаменам на годнасць сучаснага культурнага лідара ў бурапенных плынях эпохі. Сталая топіка: «на ўзлессі дом, ад казак недалёка», калоссе нівы, вечары з камарамі і песнямі, кірмашы і фэсты, касьба і жніво, «раскіданае гняздо», вогненны небасхіл і абеліск — гэта ў беларускай культуры сімволіка ідэалу ўстойлівага жыццядзеяння і гісторыі народнага лёсу, шляхоў пераадолення тупіка, створанага злой воляй чужынцаў і калабарацыяністаў.

Плынь сексуальнай рэвалюцыі Л. Левановіч паказвае на шырокім фоне традыцыйных каштоўнасцей беларускай народнай культуры, актуальнае значэнне якіх у эпоху гіпертрафіраванага геданізму аналітыкамі яшчэ як след не раскрыта. Былы ўчастковы інспектар Бравусаў у рамане «Палыновы вецер» яшчэ не ўзняўся ці, больш дакладна, не апусціўся да ўзроўню «філасофіі», якая апраўдвае заафілію і іншыя віды перверсіі, але затое змог арганізаваць у засыпаных радыяцыяй Хатынічах свінгерства — свінства, паводле разумення Пятра Мамуты.

Пакаленне Андрэя Сахуты не перажыло стадыі ачышчэння, загартоўкі і ўзвышэння духу, якая адлюстравана ў паэтыцы плыні ў творах Я. Коласа, М. Гарэцкага, К. Чорнага, М. Багдановіча, У. Жылкі, А. Моркаўкі, А. Куляшова. Ідэя чалавечага ўзвышэння вызначае таксама характар успрымання і пераасэнсавання класічнай традыцыі ў сучасным жывапісе. Прага да духоўнасці, якую бачыў у літаратуры 1970-х гадоў В. Каваленка, была неўсвядомленай прагай чалавечага ўзвышэння. Персанажы Л. Левановіча таксама патрэбу ўзвышэння больш адчуваюць інстынктам, чым усведамляюць яе. Патрэба ў духоўным узвышэнні асобы і нацыі наогул застаецца найменш асэнсаванай у сучаснай грамадскай свядомасці, хоць ад узроўню яе спасціжэння залежыць характар не толькі кагнітыўнага, але і сацыяльнага дзеяння. Узвышанае — гэта не нейкае прыватнае жаданне, а «чалавечае хаценне наогул».

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Праз усю сваю маладосць і сталасць старэйшая сястра Андрэя Марына пранесла ў душы стан адпрэчанасці ад волі да імітацыі шчасця, да недарэчнага і агіднага задаволення нікчэмнымі насалодамі. Сапраўднае ўзвышэнне ўпершыню за страчаныя ў наменклатурным коле дзесяцігоддзі жыцця Андрэй Сахута адчуў тады, калі ён з вышыні абкамаўскага крэсла «грымнуўся на зямлю» «ды ў радыяцыйную зону». Сузіранне з высокага берагу Бесядзі карціны заняпаду роднай старонкі абудзіла ў Андрэя здольнасць перажывання лёсу Айчыны. Л. Левановіч паказвае магчымасці зняможанага чалавека ў аднаўленні ўласнага ўзвышанага характару. Марыну і Андрэя Сахутаў па-новаму яднае пачуццё кроўнай блізкасці і ўзаемаразумення ў зоне татальнага радыяцыйнага спусташэння. У аснове агульнага чалавечага ўзвышэння, на думку А. Шапэнгаўэра, ляжыць пачуццё адзінства з ідэяй прыроды, далучанасці да яе стваральнай сілы. Вяртанне Сахуты ў радыяцыю стала вяртаннем да ідэі роднасці і адзінства з лёсам Айчыны і свайго народа. Тут, аднак, высветлілася, што ў пасляваеннага пакалення ўжо няма таго стога-хмарачоса, з якога так люба было сузіраць па ўсёй акрузе паэтычны ландшафт быцця, створаны вясковай грамадой у супрацоўніцтве з жыццядайнымі стыхіямі прыроды. Абязвечанае вайной пакаленне Пятра Махавікова і Андрэя Сахуты, захопленае канвеерам «давай-давай, шуруй-шуруй», не змагло застагаваць скарбы сваёй духоўнай нівы і сенажаці, каб з вышынь плёну сваёй працы убачыць дакладныя абрысы новай светабудовы. Кола філасофскіх інтарэсаў Сахуты абмяжоўвалася пераважна колам службовых абавязкаў ці квазіфілосафаў-кан`юктуршчыкаў. Падобная практыка толькі адрывала думку і волю ад свайго родавага, чалавечага інтарэсу. Толькі на прыканцы свайго акмэ Сахута змог, самастойна ўзняўшыся на вышыню духоўнага сузірання, па-новаму ўбачыць вышыні і далягляды ў творах М. Гарэцкага, М. Багдановіча, У. Караткевіча. Па ўсім відаць, што сілы і сэнсы трагічнага перажывання ў творах В. Быкава яшчэ не суразмерныя з духоўнымі запатрабаваннямі Сахуты. Л. Левановіч не перабольшвае патэнцыял і волю да сацыяльнай творчасці сваіх персанажаў. Застаючыся рэалістам, пісьменнік адлюстроўвае першыя самастойныя крокі ў самарэалізацыі пакалення, якое было асуджана на фізічную, а потым і духоўную смерць у сітуацыі жудасных эксперыментаў эпохі. Лабанаўскае зямляцтва, сабраўшыся ў навагоднюю ноч у мінскай кватэры Сахутаў, спрабуе вызначыць перспектыву суверэннай Беларусі. У атмасферы навагодніх імправізацый была абвешчана і праграма на будучыню: ССДД — самастойнасць, самабытнасць, духоўнасць, дабрабыт — альтэрнатыва канвееру «давай-давай,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

шуруй-шуруй»: «Чатыры словы як чатыры бакі свету. Як чатыры поры года. Чатыры вуглы хаты»[28]. Зямляцтва выйшла з-пад апекі бюракратычнага монстра.

Заканчваецца «шасцікніжжа» Л. Левановіча гімнам-зваротам да Палыновага ачышчальнага ветру — топасам, характэрным для беларускай вербальнай культуры на працягу ўсёй яе гісторыі з часоў язычніцтва:

«А калі ты, Палыновы вецер, залятаеш у хату, то заклікаеш да абнаўлення. Ты рушыш усё, што састарэла, згніло і аджыло свой век. А ты, Вецер, нідзе не нараджаешся і нідзе ніколі не паміраеш, бо Ты вечны.

Як вечная наша Зямля-Матухна. І на ёй Чалавек»[29].

Як і ў іншых лірычных адступленнях аўтара, тут зноў ажываюць сэнсы семантычнага ланцуга, створанага ў свой час аўтарам «Слова пра паход Ігараў», Я. Коласам, М. Багдановічам. І вельмі выразна адчуваецца «палыновая» семантыка А. Куляшова з характэрнай для яго сінэстазіяй фальклорнай мудрасці і класічна выштукаванай формы:

Палын — і клопат матчын, і дарога,
І слёзы, і ўспамін сіроцкіх меж,
І горыч малака таго, якога
Ніякай смагай з вуснаў не сатрэш.[30]

Прыродная адоранасць самаахвярная праца, любоў да Айчыны забяспечылі Л. Левановічу вялікі поспех на ніве беларускай літаратуры. Высока ацэнены грамадствам яго творчыя набыткі ў публіцыстыцы і драматургіі, а ў творах буйной празаічнай формы выразна бачацца рысы станаўлення новага беларускага рамана, арыентаванага на сацыяльна дзейны сінтэз нацыянальнага і агульнаеўрапейскага духоўнага вопыту.

---

[28] Левановіч Л. Палыновы вецер. С. 219.
[29] Там жа. С. 222.
[30] Куляшоў А. «Палын не трэба...» // Зб. тв.: у 5 т. Т. 1. Мінск, 1974. С. 352.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ